## Білет 9

**Практычнае заданне.**

**Уклад беларускага народа ў перамогу над нацысцкай Германіяй. Ураджэнцы Беларусі на франтах Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войн.**

**Выкарыстоўваючы прадстаўленыя матэрыялы, адкажыце на пытанні (выканайце заданні):**

1. Назавіце ўраджэнцаў Беларусі, якія вызначыліся ў баявых дзеяннях на франтах Вялікай Айчыннай вайны.
2. У чым выявілася прызнанне міжнароднай супольнасцю заслуг Беларусі ў разгроме нацызму?
3. Складзіце схему "Уклад беларускага народа ў перамогу над нацысцкай Германіяй".
4. У сучасным свеце спрабуюць забыцца, хто сапраўды перамог у Вялікай Айчыннай вайне. У краінах Еўропы зносяць помнікі савецкім салдатам і ставяць помнікі фашысцкім катам. Польшча праводзіць мерапрыемствы, прымеркаваныя да вызвалення вязняў Асвенцыма, без удзелу прадстаўнікоў Беларусі і Расіі. У нямецкіх СМІ паведамляюць аб тым, што гэты канцлагер вызвалілі амерыканскія войскі. Робіцца ўсё, каб сцерці памяць аб Вялікай Перамозе, аб нашых пераможцах….. Прывядзіце два факты, якія даказваюць значны ўклад беларускага народа ў Перамогу над нацысцкай Германіяй.

**І. Ураджэнцы Беларусі на франтах вайны** (*па матэрыялах навучальных дапаможнікаў «Гісторыя Беларусі. 1917 г. – пачатак XXI ст. 9 клас», «Вялікая Айчынная вайна савецкага народа ў кантэксце Другой сусветнай вайны»).*

На франтах Вялікай Айчыннай вайны змагалася больш за 1,3 млн. беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі. З іх 446 атрымалі званне Героя Савецкага Саюза. Чацвёра – П. Галавачоў, І. Гусакоўскі, С. Шутаў, І. Якубоўскі – удастоены гэтага звання двойчы. 67 чалавек сталі кавалерамі ордэна Славы трох ступеней. Каля 400 тысяч воінаў - беларусаў і ўраджэнцаў Беларусі ўзнагароджаны баявымі ордэнамі і медалямі.

…Пры абароне Ленінграда ў жніўні 1941 г. ураджэнец Сенненшчыны наводчык танкавай гарматы Андрэй Усаў у адным баі снайперскім агнём асабіста падбіў 22 танкі праціўніка. Гэта адзіны выпадак у гісторыі….

…Сын селяніна з в. Машканы Сенненскага раёна, лётчык Аляксандр Гаравец на Курскай дузе прыняў бой з 20 варожымі бамбардзіроўшчыкамі, збіў дзевяць самалётаў. Ён адзіны ў свеце лётчык, які ў адным паветраным баі збіў столькі самалётаў.

У баях на тэрыторыі Латвіі зачыніў сваім целам страляючы кулямёт ураджэнец Міншчыны Пётр Купрыянаў.

…Медсястра Зінаіда Тусналобава-Марчанка за восем месяцаў вынесла з поля бою 123 параненых. Цудам засталася ў жывых пасля ранення і абмаражэння, перанесла восем аперацый, страціла рукі і ногі. Усё яе жыццё стала подзвігам, яна зноў навучылася хадзіць і пісаць, нарадзіла дзяцей. Ёй было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. У знак прызнання выключных прафесійных якасцей, праяўленых пры аказанні дапамогі параненым і хворым у гады Вялікай

Айчыннай вайны, Міжнародны камітэт Чырвонага Крыжа прысудзіў ёй вышэйшую ўзнагароду - медаль імя Флорэнс Найтынгейл.
… Пад кіраўніцтвам ураджэнца Беларусі, генерала арміі А.І.Антонава ў 1944 годзе распрацавана Беларуская стратэгічная наступальная аперацыя «Баграціён», якая стала па праве вяршыняй палкаводчага мастацтва.

**II. Барацьба ў тыле ворага** *(па інфармацыйных матэрыялах Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь)*

374 тыс. партызан і звыш 70 тыс. падпольшчыкаў вялі барацьбу на акупіраванай ворагам тэрыторыі. Усяго за тры гады гераічнай і цяжкай барацьбы ў тыле ворага беларускія партызаны і падпольшчыкі знішчылі больш за 500 тыс. гітлераўцаў, разграмілі 29 чыгуначных станцый, 948 штабоў і гарнізонаў, пусцілі пад адхон 11 128 эшалонаў і 34 бронецягнікі праціўніка; збілі і спалілі на аэрадромах 305 самалётаў, падбілі 1355 танкаў і бронемашын, знішчылі 939 ваенных складоў. Пад канец 1943 г. 60% тэрыторыі рэспублікі знаходзілася пад партызанскім кантролем.

Падпольныя арганізацыі дзейнічалі практычна ва ўсіх буйных населеных пунктах акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Самае буйное гарадское антыфашысцкае падполле дзейнічала ў Мінску.

Па сваіх маштабах, ваенных і палітычных выніках партызанскі і падпольны рух на акупіраванай тэрыторыі БССР набыў стратэгічнае значэнне, ператварыўся ў адзін з буйных фактараў разгрому ворага.

... Апынуўшыся ў канцэнтрацыйных лагерах на тэрыторыі Еўропы, многія нашы землякі наладжвалі кантакты з удзельнікамі антыфашысцкага руху на волі, арганізоўвалі ўцёкі з месцаў зняволення, прымалі ўдзел у стварэнні баявых цэнтраў, якія вялі актыўную барацьбу супраць нацыстаў.

У кастрычніку 1943 г. у Францыі быў створаны Цэнтральны камітэт былых савецкіх ваеннапалонных. Пад яго кіраўніцтвам вязні, сярод якіх было шмат беларусаў, наносілі гітлераўцам значныя страты. У гэтай краіне дзейнічаў таксама асобны жаночы атрад «Радзіма», арганізаваны былымі беларускімі партызанкамі і падпольшчыцамі, які праславіў сябе баявымі справамі. Камандзірам яго была абраная мінчанка Н.І. Лісавец, а пасля – Р.З. Сямёнава-Фрыдзон. Абедзвюм было прысвоена званне лейтэнанта французскай арміі.

**III. З пратакола пасяджэння глаў дэлегацый Аб'яднаных Нацый.** *(27 красавіка 1945 г.)*

«...С-р Молатаў кажа, што ён упаўнаважаны зрабіць заявы ад імя ўрадаў Украінскай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі…

Важная роля, якую абедзве рэспублікі адыгралі ў барацьбе з агульным ворагам. У гэтых адносінах яны вылучаюцца сярод шаснаццаці рэспублік, таму што, па крайняй меры, мільён грамадзян кожнай са згаданых рэспублік служыў у радах Чырвонай Арміі. Яны таксама прымалі самы актыўны ўдзел у вайне. Германія пачала сваё нападзенне на Савецкі Саюз з захопу Украінскай і Беларускай рэспублік, менавіта яны перанеслі самыя цяжкія выпрабаванні, звязаныя з нашэсцем. У заключэнне с-р Молатаў паўтарае сваю прапанову

камітэту прыняць рашэнне аб уключэнні гэтых дзвюх рэспублік у лік першапачатковых членаў Арганізацыі.

... Прэзідэнт Рузвельт лічыць, што важнае становішча, якое займаюць Украінская і Беларуская рэспублікі ў Савецкім Саюзе, і пакуты, якія яны перанеслі падчас вайны, роўна як і ўклад, зроблены імі ў агульную справу перамогі, цалкам апраўдваюць іх прыняцце ў Арганізацыю. Таму ён ад імя ўрада Злучаных Штатаў падтрымлівае прапанову, зробленую Молатавым».